# Як спявае Гродзеншчына

*У Гродзенскім абласным метадычным цэнтры народнай творчасці адбылася прэзентацыя кнігі «Гродзеншчына спяваючая» Марыны Петуховай і Марка Копа, якую ладзіў аддзел краязнаўства Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Я.Ф. Карскага. Да гэтай кнігі вельмі добра стасуецца слова «першы». Упершыню не толькі на Гродзеншчыне, але і ва ўсёй Беларусі з'явілася даследаванне па гісторыі станаўлення і развіцця харавой культуры рэгіёна. Выданне гэтай працы абвясціла і пра першую творчую даследчую дынастыю на гарадзенскіх землях. Бацька і дачка, Марк Аляксандравіч і Марына Маркаўна, падрыхтавалі ўнікальную кнігу, якая адразу ж стала бібліяграфічнай рэдкасцю.*

Жыццё Марка Копа аддадзенае служэнню беларускай культуры Прынёманскага краю. Ён вядомы культурны дзеяч, кампазітар, педагог. Амаль 30 гадоў Марк Аляксандравіч узначальваў абласны метадычны цэнтр народнай творчасці, 10 гадоў займаўся падрыхтоўкай творчай змены ў Гродзенскім культасветвучылішчы, у яго кампазітарскім багажы каля 200-х песняў. У 1993 – 1998 гадах быў абраны старшынёй Рэспубліканскага Савета дырэктараў абласных метадычных цэнтраў народнай творчасці пры Беларускім дзяржаўным інстытуце праблемаў культуры. Марк Аляксандравіч – ініцыятар і кіраўнік клуба творчай інтэлігенцыі «Грані» Гродзенскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці. Па выніках II Усебеларускага фестывалю народнага мастацтва «Беларусь – мая песня» клубу прысвоенае званне лаўрэата і ганаровае найменне «народны». Шматгадовая працоўная і творчая дзейнасць Марка Аляксандравіча ўганараваная шматлікімі ўзнагародамі.

Марына Аляксандраўна годна працягвае творчыя традыцыі бацькі. Працавала артысткай хору Белдзяржтэлерадыёкампаніі пад кіраўніцтвам народнага артыста СССР і БССР Віктара Роўды, Гродзенскай капэлы, з 1998 года – выкладчык харавых дысцыплінаў Гродзенскага музычнага каледжа. У 2008 годзе ўганараваная званнем лаўрэта прэміі імя А.І. Дубко Гродзенскага аблвыканкама «За творчыя дасягненні ў галіне культуры і мастацтва» ў намінацыі «Настаўнік года».

Яе намаганнямі быў створаны маладзёжны акадэмічны хор «Акварэль», і цягам васьмі гадоў Марына Маркаўна была нязменным мастацкім кіраўніком і дырыжорам гэтага калектыву. Акадэмічны хор уганараваны званнем «народны», стаў лаўрэатам II Усебеларускага фестывалю народнага мастацтва «Беларусь – мая песня», уладальнікам гран-пры сярод замежных хароў VIII Міжнароднага фестывалю-конкурсу сакральнай музыкі «Lapskie Te Deum» (г. Лапы, Польшча). Па класе вакалу і пастаноўкі голасу выхаванцы Марыны Маркаўны неаднаразова станавіліся пераможцамі міжнародных конкурсаў.

Кніга «Гродзеншчына спяваючая» – своеасаблівы экскурс па старонках гісторыі харавога мастацтва на Гродзеншчыне, дае магчымасць пазнаёміцца з лепшымі харавымі калектывамі рэгіёна, з геаграфіяй іх міжнародных гастроляў, шматлікіх фестываляў і конкурсаў. Упершыню асвятляецца роля інстытута шэфства вядомых дзеячаў культуры, спецыялістаў абласных дамоў народнай творчасці, дзіцячых мастацкіх школаў, сярэдніх і вышэйшых спецыяльных навучальных установаў над мастацкімі калектывамі. Асаблівая ўвага надаецца фармаванню гродзенскай вакальна-харавой і кампазітарскай школы. На старонках кнігі паўстаюць творчыя партрэты выбітных хармайстраў і кампазітараў.

Уражаннямі пра кнігу падзяліліся знакаміты знаўца беларускай культуры, прафесар Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта Аляксей Пяткевіч, вядомыя дзеячы беларускай культуры Зінаіда Арцюховіч, Алесь Лойка ды іншыя.

Сапраўдным аздабленнем імпрэзы сталі выступленні творчых калектываў: дзіцячага ансамбля «Акварэлька», народнага хору Гродзенскага дзяржаўнага музычнага каледжа і іншых.

*Любоў ТУРМАСАВА, загадчык аддзела краязнаўства Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Я.Ф. Карскага*

